# «Бедныя Каталікі», ці зварот ерэтыкоў да каталіцтва

Аляксандра Валодзіна

Да зместу

Сярэднявечча часта называюць Цёмнымі Стагоддзямі, патлумачыўшы гэта дамінаваннем каталіцкай царквы над усімі сферамі жыцця. Тэрмін гэты быў прыдуманы яшчэ ў часы Адраджэння, потым шмат разоў абвяргаўся, але ўсё роўна, як толькі гаворка заходзіць пра Сярэднявечча, кожны лічыць сябе літаральна абавязаным узгадаць пра гэтую назву.

На мой погляд, датычна да Сярэднявечча варта казаць пра дамінаванне не каталіцкай царквы, а веры і рэлігіі ўвогуле, бо рымская царква, нягледзячы на ўсе свае намаганні, так і не змагла дасягнуць неабмежаванага панавання. Канкурэнцыю ў гэтай справе складалі шматлікія секты і ерэтычныя рухі, якія або прыходзілі з Усходу, або нараджаліся ў глыбінях самой каталіцкай рэлігіі, прычым часцей за ўсё менавіта самымі адданымі яе прадстаўнікамі.




Манета з выявай Інакенція III

Адным з такіх сярэднявечных ерэтычных рухаў з'яўляецца вальдэнсійскі. Яго заснавальнік, Пётр Вальдо, абвясціўшы ідэал апостальскага жыцця, захапіў сваімі казанямі вялікую колькасць шчырых вернікаў, схіляючы іх да вандроўнага жыцця, падобнага жыццю першых паслядоўнікаў Хрыстовых. Але, на жаль, па шматлікіх прычынах, вальдэнсійскі рух, разрастаючыся і амарфізуючыся, выйшаў за межы царквы. Гісторыя дзейнасці Вальдо – гэта гісторыя яго спробаў рознай ступені паспяховасці здабыць сабе і сваім паплечнікам права на пропаведзь і захаваць цэласнасць сваёй "секты". Але амаль усе яго пачынанні пацярпелі крах.

Са смерцю Пятра Вальдо гісторыя вальдэнсійскага руху ўваходзіць у новы этап – фактычна шлях да канчатковага расколу: тыя, што вярнуліся ў каталіцтва, і тыя, хто будзе адлучаны на IV Латэранскім саборы. На першы план, як бы замяняючы Пятра Вальдо, выходзіць новы дзеяч – Дуранд дэ Оска (Durandus de Osca).У 1207 годзе адбываецца Сабор у Пам'е (Pamiers). Гэта было вельмі прадстаўнічае мерапрыемства: з каталіцкага боку на ім прысутнічалі біскуп кастыльскага горада Озмы дон Дыега са сваім любімцам кафедральным прыёрам Дамінікам (будучы заснавальнік аднайменнага ордэна), біскупы тулузскі і каркасонскі. Вальдэнсаў прадстаўляў вышэйадзначаны Дуранд дэ Оска (дарэчы, менавіта гэты факт з'яўляецца доказам тога, што самога Вальдо ўжо не было на гэтым свеце, бо ў адваротным выпадку ён бы абавязкова ўзначаліў сваіх прыхільнікаў).У якасці суддзі быў абраны магістр Арнальд з Кампнангана. Для правядзення дыспута быў адведзены палац сына графа дэ Фуа, Раймонда Ражэ, жонка і дачка якога таксама былі прыхільніцамі Пятра. Хоць каталікі і прайгралі дадзены дыспут, але Раймонду як прадстаўніку мясцовай адміністрацыі давялося пакараць некаторых асабліва радыкальных вальдэнсаў**[1]**. Але выявілася і другая частка – пэўная колькасць былых "сектантаў" на чале з самім Дурандам заявіла аб сваёй поўнай лаяльнасці да каталіцкай царквы. Рух раскалоўся першы раз. Пазней з яго вылучыцца група так званых "італьянскіх" вальдэнсаў, узначаленых Бернардам Прымам (Bernardus Primus). На мой погляд, істотна спыніцца на лёсе тых вальдэнсаў, якія засталіся пасля дыспута ў Пам'е разам з Дурнадам дэ Оска. І першае, на што варта звярнуць увагу, гэта паходжанне самага Дуранда. Фактычных ведаў пра гэта мы не маем, вядома толькі яго імя de Osca, што азначае "з Оскі". Але месца з такой назвай не існуе! Даследчыкі вылучаюць два гарады, якія гіпатэтычна маглі паслужыць асновай для такой дзіўнай назвы: гэта Оскес у Рурку (Osques, Rouergue) (Францыя) і Уэска ў Арагоне (Huesca, Aragon) (Іспанія).Далей нам вядома, што Дуранд з'яўляецца

Святы Дамінік, заснавальнік



аўтарам кнігі Liber Antiheresis[2], накіраванай збольшага супраць катараў у абарону каталіцтва. Таксама ў кнізе ўтрымліваюцца некаторыя звесткі пра светапогляд вальдэнсаў у першыя гады іх існавання. Але недахоп кнігі заключаецца ў тым, што яна напісана на класічнай лаціне і ўтрымлівае вялікую колькасць складаных сінтаксічных канструкцый і ідыёмаў, што робіць яе вельмі складанай для прачытання нават сучаснаму падрыхтаванаму даследчыку, не кажучы ўжо пра чалавека часоў высокага Сярэднявечча, бо вядома, што ў тыя часы карысталіся не класічнай, а так званай "народнай" лацінай. Гэтая праца потым была перапрацавана на аснове ўласнага вопыту аўтара і яго паплечнікаў у прапаведаванні і палеміцы супраць ерэтыкоў. У выніку былі напісаны Opusculum contra hereticos et eorum errors і Liber contra Manichaeos. Але найбольш каштоўная інфармацыя пра гэтую даволі невялікую групу (дакладныя дадзеныя адсутнічаюць) знаходзіцца ў матэрыялах цыляры рымскага пантыфіка. З лістоў папы Інакенція III архібіскупам і біскупам Марсэля, Барселоны, Оскеса/Уэскі, Мілана, Нарбоны, Утыкі, Тараконы і Генуі, а таксама іх падначаленым, кардыналам-легатам і, у некаторых выпадках, гарадскім капітулам, напісаных у 1208, 1209 і 1212 гадах, мы ведаем, што папа быў цалкам задаволены паводзінамі, словамі і верай Дуранда дэ Оска, Дуранда з Найака (Durandus de Naiaco), Гуйлема з Сант-Антонія (Guillemus de Sancto Antonio), Іаана з Нарбоны (Joannus'a de Narbona), Эрменгаўда (Ermengaudus), Бернарда Бітэрэнсіса (Bernardus Bitterrenses), Раймунда з Сан-Паўла (Raymundus de Sancto Paulo) і Эрбіна (Ebrinus) з секты вальдэнсаў, а таксама яго спадарожнікаў (socii).



г. Оскес у Рурку (Osques, Rouergue)

Далей у лісце (было напісана некалькі лістоў з падобным зместам, які адрозніваўся асобнымі дэталямі, кожнаму з іерархаў паказанага спіса) гаварылася, што гэтыя людзі "ізноў далучаны" да царквы самім папам, і таму ён настойліва рэкамендуе сваім адрасатам прыняць "улюблёных сыноў" "ласкава". Адсюль можна зрабіць выснову, што, па-першае, вальдэнсаў раней адлучалі (магчыма, маецца на ўвазе рашэнне Веронскага Сабора 1184 г. вынікам якога стала была папы Луцыя III Ad Abolendam)[3], а па-другое, што яны скардзіліся на дрэннае стаўленне да іх з боку прэлатаў. Гэта пацвярджаецца наступнымі словамі: "... і тым не менш вы іх [вальдэнсаў] пераследуеце/караеце".

Арэал дзейнасці "Бедных Католікаў" можна вывесці з пераліку біскупстваў, кіраўнікам якіх былі накіраваныя лісты. Да таго ж у пасланні да службовых асобаў Мілана гаворыцца, што далучаюцца і браты, якія самі не здолелі прыехаць у Рым, а "засталіся ў Італіі". Тут жа разглядаецца вельмі цікавая справа з зямельнай уласнасцю ("лугамі") і будынкам, у якім збіраліся нейкія "100 іншых" (відаць, вальдэнсаў) і які быў разбураны мінулым міланскім архібіскупам. І вось папа загадвае дзеючаму архібіскупу, каб той вярнуў тыя лугі ў тым выпадку, калі якія-небудзь іншыя людзі не пацвердзяць свае правы на іх, або даў гэтым вальдэнсам якое-небудзь іншае месца па свайму выбару, "дзе яны хочуць збірацца для настаўлення сябе і сяброў сваіх у боязі Божай. Апошнім загадам можна лічыць: "не дазваляй, каб яны [вальдэнсы] былі кім-небудзь выпадкова патрывожаныя, наадварот, лічыце, што яны ад усіх плётак і спакусаў вольныя, і як ва ўсіх удакладняльных запісках, так і ў іншай дапамозе падтрым лівай у імя Божае".

З тых жа лістоў нам вядома, што гэтыя людзі, а таксама яшчэ некалькі чалавек стварылі арганізацыю пад назвай "Бедныя Каталікі", і ў лісце ад 1208 года нават утрымліваецца нешта накшталт Споведзі Веры і Статуту гэтага таварыства.Маюцца ўказанні на існаванне ў асяроддзі былых вальдэнсаў "школаў", у якіх праходзілі абмеркаванні і тлумачэнні Пісання найбольш дасведчанымі клірыкамі з асяроддзя "Бедных Католікаў", а таксам пропаведзі супраць ерэтыкоў ( у большасці сваёй, натуральна, супраць катараў, але часткай і супраць былых аднадумцаў вальдэнсаў)[4].

Далей Дуранд дэ Оска не раз апеляваў да папы з просьбай дазволіць яму стварыць свой манаскі ордэн. Яны нават мелі памяшканне, падараванае ім адным з заможных прыхільнікаў у дыяцэзе

Элен (Elene) ля Перпін'яна (Perpignan) ў Русільёне (Roussillon)**[5]** . Але ўсім вядома адмоўнае стаўленне папы да новых ордэнаў: забарона на іх стварэнне нават была ўнесена асобным, XIII, канонам у "канстытуцыю" IV Латэранскага Сабора.

Дуранд дэ Оска яшчэ не раз апеляваў да папы, нават прапанаваў дэталёва распрацаваны статут свайго ордэна. Быў нават навіраваны біскуп гэтага дыяцэза для праверкі адпаведнасці выканання гэтага статута. І хоць праверка пацвердзіла ўсе словы "Бедных Католікаў", папу было не пераканаць. Не паддаліся на ўгаворы і наступныя пантыфікі. К 1237 г. сітуацыя была настолькі крытычная, што Дуранд згодны ўжо прыняць нават статут любога іншага ордэна (звычайна новым ордэнам курыя прызначала агусцінскі ці бернардынскі статуты), не настойваючы нават на ўласным.

Трэба звярнуць увагу на той факт, што ўжо на момант дыспуту у вальдэнсійскім руху прасочвалася пэўная структура: секта падзялялася на паўнапраўных членаў, якія пакінулі мірскае жыццё і ідуць па шляху апосталаў, здабываючы сабе ежу і адзежу праз міласціну і распаўсюджваючы ісцінную веру Хрыстову (socii), і тыя вернікі, што застаюцца са сваімі сем'ямі і гаспадаркамі, але імкнуцца да сапраўднага праведнага жыцця (amici/amicae). Такім чынам можна сказаць, што ў лона Царквы вярнулася не толькі маленькая група прыхільнікаў Дуранда, але і даволі значная колькасць "сяброў", якія знаходзіліся пад уплывам вышэйадзначаных прапаведнікаў. Здаецца, усё цудоўна: людзі жадаюць далучыцца да царквы, яна прымае іх, дае права прапаведваць (г. зн. тое, у чым было столькі разоў адмоўлена самому Вальдо), разам з імі ў царкву вяртаецца даволі значная колькасць вернікаў...

Але не ўсе ўспрымаюць "Бедных Католікаў" так прыязна. Асабліва ж гэта датычыцца мясцовага кліру, які, акрамя цалкам зразумелай зайздрасці да папулярнасці сярод шырокіх колаў спадарожнікаўДуранда, людзей бездакорнай маральнай чысціні, проста падазрона ставіцца да любога, хто мае ерэтычнае мінулае. Ды і "школы" "дурандзістаў" маюць настолькі вялізную прыцягальнасць, што некаторыя цывільныя забываюцца нават наведваць афіцыйную царкву. Але нашмат больш нараканняў выклікае хуткасць, з якой яны пераварочваюць былых ерэтыкоў. Яна настолькі вялікая, што, на думку святарства, зніжае якасць гэтага перавароту.

Вельмі рана, яшчэ ў 1208 годзе, Дуранд меў вельмі блізкія стасункі з Дамінікам дэ Гусманам (у лістах падкрэсліваецца, што паства трымаецца майстэрствам Дамініка), будучым заснавальнікам ордэна



*г. Уэска ў Арагоне (Huesca, Aragon) (Іспанія)*

дамініканцаў. Магчыма, яны пазнаёміліся яшчэ на дыспуце ў Пам'е. Так ці інакш, пазней менавіта тыя дамы, у якіх пражывалі "Бедныя Католікі", сталі матэрыяльнай асновай для дамініканскага ордэна**[6]**. Самі ж спадарожнікі ўліліся ў 1256 г. у шэрагі аўгусцінцаў-ерэмітаў**[7]**. Неабходна адзначыць, што пісьмовай палемікай з катарамі займаўся не толькі сам Дуранд, але і некаторыя з яго паплечнікаў. Да прыкладу, Эрменгаўд з Без'е (Ermengaud of Bйziers) стварыў трактат Contra Haereticos супраць катараў.

І нават нягледзячы на такі высокі прафесійны ўзровень і імкненне да суровага аскетычнага манаскага жыцця, спалучанага з пропаведдзю супраць ерэтыкоў ("прыкладам даводзяць памылкі свае [іншых людзей]пакідаць у цемры"), "Бедныя Католікі" не знайшлі падтрымкі з боку каталіцкай царквы і да да канца 40-х гадоў XIII стагоддзя рассяліся між іншых ордэнаў. Магчыма, менавіта таму Рым і перажыў столькі катаклізмаў, што не ўмеў у час прымаць у свае шэрагі найбольш адданых змагароў за веру. Кожнае такое прыманне ставілася велізарным набыткам, быў гэта Францыскі Асізкі ці Ігнацыо Лайола, а кожны адмоўны адказ – не менш велізарнай стратай. І мена

віта тут мэтазгодна адказаць на пытанне, якое, пэўна, узнікае ва ўважлівага чытача: чаму ж “войска Хрыстова” не папоўнілася новым членам – ордэнам “Бедных Каталікаў”? Падсумуем прычыны, якія так ці інакш праслізгвалі па тэксце:

1. Невялікая папулярнасць Дуранда і яго прыхільнікаў сярод шырокіх слаёў грамадства, бо яны былі, нягледзячы на паспяховыя прапаведзі, больш кніжнікамі;

2. Актыўная дзейнасць даміниканскага ордэна, які ў працэсе свайго нараджэння літаральна паглынаў больш дробныя ўтварэнні;

3. Нежаданне каталіцкай царквы ўвогуле і папы рымскага асабіста ствараць новыя манаскія ордэны.

## Спасылкі:

**[1]** Осокин Николай. История альбигойцев и их времени. – М., 2000. – С. 218.

**[2]** Audisio, Gabriel; Davison, Claire. The Waldensian dissent: persecution and survival, c. 1170-c. 1570. – Cambridge University Press, 1999. – [Electronic resourse]. – P. 24.

**[3]** Падрабязней глядзі Volpe, Gioacchino; Violante, Cinzio. Movimenti religiosi e sette ereticali nella societa medievale italiana: nella societa medievale italiana (secoli XI-XIV). – Donzelli Editore, 1997.

**[4]** Schaff, Philip. History of the Christian Church, Volume V: The Middle Ages. A.D. 1049-1294. – Grand Rapids, MI: Christian CLassics Ethereal Library, 1882. – [Electronic resourse]. – P. 263.

**[5]** Cameron, Euan. Waldenses: Rejections of Holy Church in Medieval Europe. – Blackwell Publishing, 2001. – [Electronic resourse]. – p. 53.

**[6]** Осокин Николай. Паказ. сач. – С. 219, 424.

## Літаратура:

1. Карсавин Лев. Очерки средневековой религиозности // История ересей. – М., 2007.

2. Осокин Николай. История альбигойцев и их времени. – М., 2000. – С. 218.

3. Audisio, Gabriel; Davison, Claire. The Waldensian dissent: persecution and survival, c. 1170-c. 1570. – Cambridge University Press, 1999. – [Electronic resourse].

4. Cameron, Euan. Waldenses: Rejections of Holy Church in Medieval Europe. – Blackwell Publishing, 2001. –[Electronic resours].

5. Schaff, Philip. History of the Christian Church, Volume V: The Middle Ages. A.D. 1049-1294. – Grand Rapids, MI: Christian CLassics Ethereal Library, 1882. –[Electronic resourse].

6. Volpe, Gioacchino; Violante, Cinzio. Movimenti religiosi e sette ereticali nella societa medievale italiana: nella societa medievale italiana (secoli XI-XIV). – Donzelli Editore, 1997.